РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама
20 сакавіка 2023 г. № 2

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXXI рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

На абласны тур XXXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» былі прадстаўлены 12 матэрыялаў ад наступных бібліятэк: Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая ЦГБ імя А.С. Пушкіна», Гарадзішчанская гарпасялковая бібліятэка ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Драгічынская раённая дзіцячая бібліятэка ДУК «Драгічынская РЦБС», Драгічынская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Драгічынская РЦБС», Жабінкоўская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Жабінкоўская РЦБС», Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», Пінская гарадская дзіцячая бібліятэка імя Я. Коласа ДУК «Пінская ГЦБС», сельская бібліятэка аг. Моталь ДУК «ЦРБ імя Ф. І. Панфёрава» г. Іванава, Сакалоўская сельская бібліятэка ДУК «Бярозаўская РБС», Яглевіцкая сельская бібліятэка ДУК «Івацэвіцкая РБС», Лагішынская гарпасялковая бібліятэка ДУК «Пінская РЦБС», Пружанская раённая дзіцячая бібліятэка імя А. Лось ДУК «Пружанская ЦБС».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію статута ўстановы культуры, фотаздымкі работ, дадаткі ў выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А. Я., калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць для ўдзелу ў XXXI рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Пінскую гарадскую дзіцячую бібліятэку імя Я. Коласа ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Лагодзіч Дзіна Анатольеўна) – I месца за плённую працу па пошуку, захаванні і папулярызацыі спадчыны народнага паэта Беларусі Я. Коласа праз стварэнне электроннага рэсурсу «Палескімі сцяжынкамі Якуба Коласа»;

Драгічынскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Валадкевіч Марына Паўлаўна) – II месца за шматгранную пошукавую працу па даследаванні і захаванні матэрыялаў пра В. Ф. Макуху, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, самабытнага скульптара і разьбяра па дрэве.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Жабінкоўскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Жабінкоўская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (намеснік дырэктара Скачыкоўская Марына Анатольеўна) – I месца за інавацыйны падыход да павышэння турыстычнай прывабнасці г. Жабінка праз стварэнне інфармацыйна-краязнаўчага кантэнту «QR-гид по Жабинке» ў Інтэрнет-прасторы.

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна» (дырэктар Гарадзецкая Святлана Іванаўна) – I месца за рознабаковую станоўчую работу па далучэнні да чытання твораў мясцовых пісьменнікаў розных катэгорый чытачоў праз правядзенне паэтычнага марафона «Читающий бульвар»;

Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Пляшэвіч Вольга Анатольеўна) – II месца за актыўную шматгранную дзейнасць па прыцягненню да чытання і папулярызацыю пісьменнікаў-землякоў у рамках літаратурнага фестывалю «Флер’яноўскія чытанні».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Сакалоўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Папко Таццяна Мікалаеўна) – I месца за актыўную працу цэнтра дзіцячага чытання пры бібліятэцы «Я чытаю. Я расту» і афармленне бібліятэчнай прасторы з улікам сучасных тэндэнцый;

Сельскую бібліятэку аг. Моталь ДУК «Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І. Панфёрава» (бібліятэкар Каткавец Людміла

Фёдараўна) – II месца за плённую працу па выхаванні ў падрастаючага пакалення любові да роднага краю і стварэнне інфармацыйнага рэрурсу «Свет ведаў адкрывае кніга».

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Драгічынскую раённую дзіцячую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (намеснік дырэктара Касяк Ларыса Рыгораўна) – I месца за актыўную і мэтанакіраваную работу па фарміраванні грамадзянска-патрыятычных якасцей падрастаючага пакалення.

Сярод сельскіх бібліятэк:

Гарадзішчанскую гарпасялковую бібліятэку ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (загадчык Толах Наталля Мікалаеўна) – I месца за шматгранную дзейнасць у патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў, правядзенне шэрага мерапрыемстваў, захаванне і стварэнне краязнаўчай прадукцыі патрыятычнага накурунку.

За ўдзел у абласным туры адзначыць лістамі падзякі:

Пружанскую раённую дзіцячую бібліятэку імя А.Лось ДУК «Пружанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Яглевіцкую сельскую бібліятэку ДУК «Івацэвіцкая раённая бібліятэчная сетка»;

Лагішынскую гарпасялковую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

2. Пераможцаў абласнога тура XXXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі.

3. Прадставіць для ўдзелу ў XXXI рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

Пінскую гарадскую дзіцячую бібліятэку імя Я. Коласа ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Жабінкоўскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Жабінкоўская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая ЦГБ імя А.С. Пушкіна»;

Сакалоўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»;

Драгічынскую раённую дзіцячую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Гарадзішчанскую гарпасялковую бібліятэку ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А.Я.

Старшыня калегіі,
начальнік упраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама С.Б.Панасюк

Республика Беларусь
Управление культуры Брестского исполнительного комитета